ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
21.08.2023 № 273

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» для VI–X класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI–X класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната з рускай мовай навучання і выхавання для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 175 гадзін: па 35 гадзін у кожным класе (1 гадзіна на тыдзень).

Колькасць гадзін, прадугледжаная ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы на засваенне вучэбнага матэрыялу адпаведнай тэмы, з'яўляецца прыкладнай і залежыць ад выбару настаўнікам метадалогіі навучання і выхавання, адпаведных відаў дзейнасці, разумовых і фізічных магчымасцей вучняў. Настаўнік мае права пераразмеркаваць колькасць гадзін на вывучэнне пэўных тэм у межах гадзін, адведзеных на авалоданне вучэбным прадметам «Літаратурнае чытанне» на працягу навучальнага года. У межах кожнай тэмы вызначаны спіс пэўных мастацкіх твораў. Настаўнік мае права выбару тэкстаў для чытання і абмеркавання, астатнія тэксты могуць быць прапанаваны для дадатковага чытання. За кошт гадзін, вызначаных на вывучэнне тэмы, па меры неабходнасці рэкамендуецца выдаткоўваць час на абмеркаванне прачытаных дадаткова твораў (у тым ліку ў перыядычным друку).

3. Мэта вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» – паслядоўнае ўдасканаленне навыкаў чытання і ўмення ўспрымаць мастацкі твор у адзінстве яго формы і зместу для ўзбагачэння сацыяльнага вопыту на карысць будучага самастойнага жыцця ў грамадстве.

4. Задачы:

фарміраванне ў вучняў устойлівай матывацыі да чытання і патрэбы ў чытанні, выхаванне павагі да кнігі як крыніцы ведаў;

удасканаленне навыкаў правільнага, усвядомленага, выразнага і беглага чытання ўголас і моўчкі («сам сабе»);

развіццё ўмення ўсвядомлена, асэнсавана чытаць мастацкія творы розных родаў і жанраў, тлумачыць змест, заключаны ў мастацкіх вобразах;

удасканаленне і замацаванне базавых чытацкіх уменняў і абагуленых спосабаў вучэбнай дзейнасці;

развіццё і карэкцыя пазнавальнай дзейнасці, звязнага маўлення вучняў;

развіццё творчых здольнасцей вучняў;

выхаванне грамадзянскіх і маральна-этычных якасцей асобы, эстэтычнага густу, садзейнічанне пашырэнню сацыяльнага вопыту вучняў.

5. Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання з улікам узроставых і псіхафізічных асаблівасцей вучняў, змястоўнага і працэсуальнага кампанентаў вучэбнага матэрыялу: славесныя інструкцыі; гутарка (уступная, абагульняючая, эўрыстычная); сэнсавы і структурны аналіз мастацкага твора; самастойная праца вучняў з тэкстам; праца над канструяваннем і пераканструяваннем тэксту; спалучэнне слова настаўніка з рознымі відамі нагляднасці (мастацкія ілюстрацыі, карціны, фота, відэа); драматызацыя мастацкіх твораў. Улічваючы асаблівасці псіхафізічнага развіцця, узровень кагнітыўнага развіцця вучняў, настаўнік індывідуалізуе іх чытацкую дзейнасць, прытрымліваючыся прынцыпу дыферэнцыяцыі навучання. Мэтазгодна спалучаць франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання і выхавання.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання вызначаецца настаўнікам самастойна.

6. Вучэбныя заняткі па літаратурным чытанні ў VI–IX класах праводзяцца паводле тэматычнага прынцыпу, таксама ўводзяцца творы вуснай народнай творчасці. У IX класе ў межах тэмы «Асветнікі зямлі беларускай» прадугледжана знаёмства з помнікамі старажытнай беларускай літаратуры, у X класе вучні знаёмяцца з агульнымі тэндэнцыямі развіцця беларускай літаратуры XX ст. Для чытання прапануюцца найбольш даступныя для ўспрымання творы асобных пісьменнікаў. Неабходна прадугледзець знаёмства з пэўнымі фактамі біяграфіі пісьменніка, аб’ём гэтай інфармацыі вызначаецца настаўнікам у залежнасці ад псіхафізічных магчымасцей вучняў і дыдактычных мэт урока. Асноўная ўвага павінна быць нададзена працы з тэкстам мастацкага твора, яго сэнсаваму і эстэтычнаму напаўненню. Таму на вучэбных занятках па літаратурным чытанні неабходна падштурхоўваць вучняў да выказвання ўласных думак, рэфлексавання з нагоды прачытанага.

Дадзеная вучэбная праграма складзена паводле дыдактычных прынцыпаў даступнасці, паслядоўнасці, сістэмнасці, мэтазгоднасці, адэкватнасці, навучання ад простага да складанага, калі падача новага матэрыялу базіруецца на ўжо вядомым і ў цеснай сувязі з ім, рэпрэзентатыўнасці (у дадзеную вучэбную праграму ўключаны лепшыя мастацкія творы розных перыядаў развіцця беларускай літаратуры).

7. Асноўныя патрабаванні да вынікаў засваення зместу вучэбнага матэрыялу заключаюцца ў тым, што ў вучняў будуць сфарміраваны: уяўленні пра ролю кнігі як асноўнай крыніцы ведаў, розныя віды чытання; уменні вызначаць паслядоўнасць дзеянняў для вырашэння канкрэтных вучэбных задач для чытання, удзельнічаць у дыялогу і абмеркаванні прачытанага, дыферынцыраваць мастацкія творы па жанрах і тэматыцы, вербальна і невербальна выказваць уражанні ад прачытанага, часткова аналізаваць мастацкі твор, суадносіць змест мастацкага твора з уласным сацыяльным вопытам.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### VI клас

Родная Беларусь (5 гадзін)

Ю. Свірка. «Твая Беларусь».

В. Сухамлінскі. «Цяпер я ведаю, якая Беларусь».

М. Чарняўскі. «Лён», «Бульба».

М. Вышынскі. «Міхедкаў лён».
В. Вольскі. «Беларускае мора».
В. Лукша. «Белавежская пушча».
Н. Галіноўская. «Родны бусел».
М. Пазнякоў. «Родная мова».
М. Гіль. «Мы бачым сонца».

Фарбы восені (4 гадзіны)

В. Вярба. «Восень».
М. Даніленка. «Восень шыла сарафан».
Р. Ігнаценка. «Лістапад у лесе».
Я. Галубовіч. «Жураўлі адлятаюць не адны».
З. Бяспалы. «Русачок і Белячок» (урывак пра восень).
У. Дубоўка. «Восень».
В. Вольскі. «Вавёрка».
Р. Ігнаценка. «Пасадзіце рабінку».
А. Ставер. «У грыбах».
К. Каліна. «Як грыбы збіраліся на парад» (казка).
Н. Галіноўская. «Хутка зіма».

Працуй – Радзіму мацуй (3 гадзіны)

Р. Бензярук. «Працавітыя і дружныя» (казка-загадка).
К. Камейша. «Духмянае дзіва».
А. Дзеружынскі. «З чым хлеб параўнаць?».
Я. Хвалей. «Урок працы».
В. Кудлачоў. «Дружная праца».
В. Хомчанка. «Наша лавачка».
В. Вітка. «Радасць».

Малюнкі зімы (4 гадзіны)

Ю. Свірка. «З першым снегам».
Я. Колас. «Зіма».
Я. Бяганская. «Сапраўдныя сябры».
М. Даніленка. «Зімовая азбука».
А. Дзеружынскі. «Кармушкі».
П. Броўка. «Зіма».
Э. Агняцвет. «Снягі, снягі...».
Н. Гілевіч. «Снежны дзед».
Г. Іванова. «Рукавічкі».
І. Муравейка. «Петрусёк у дзень зімовы...».
Я. Купала. «Зімой у лесе».
В. Лукша. «Азбука на снезе».
П. Прануза. «У нашым садзе».
У. Мазго. «Птушыная сталоўка», «Абаронцы».

Будзь чалавекам (3 гадзіны)

В. Вітка. «Чатыры пажаданні».
А. Пальчэўскі. «Добрае слова».
А. Дзеружынскі. «Дзякуй за ласку».
Н. Галіноўская. «Дзякуй, чалавек!».
Д. Слаўковіч. «Настачка».
В. Вітка. «Тры пары».
М. Даніленка. «Журка».
І. Муравейка. «Сапраўдны гаспадар».
С. Панізнік. «Дабрыня».

Вусная народная творчасць (4 гадзіны)

«Казка пра быка і яго сяброў».
«Разумная дачка» (казка).
«Стары бацька» (казка).
«Залаты птах» (казка).
«Хітры мужык» (казка).

Вясна-чараўніца (4 гадзіны)

Л. Шырын. «Песня ручая».
Я. Колас. «Прылёт птушак».
К. Цвірка. «Вясна».
Я. Галубовіч. «Вожык і ручаёк» (казка).
В. Вярба. «Пралеска».
К. Каліна «Надыход вясны» (казка).
Н. Гілевіч. «Вітаю вясну».
З. Бяспалы. «Русачок і Белячок» (урывак пра вясну).
З. Бядуля. «Вясной».

Ішла вайна народная (4 гадзіны)

А. Вольскі. «Май».
В. Ткачоў. «Зямля з Хатыні».
Н. Галіноўская. «Родны бусел».
В. Хомчанка. «Тры каскі».
А. Капусцін. «На Партызанскім востраве».
А. Савіцкі. «Дарога ў школу».
«Самае моцнае слова ў свеце» (легенда).

Старонкі лета (4 гадзіны)

Я. Колас. «Лета».
К. Буйло. «Рэха».
Р. Барадулін. «Загадкі на градках».
У. Паўлаў. «Перад дажджом».
М. Пазнякоў. «Па ягады».
П. Сушко. «Па арэхі».
П. Ткачоў. «Ціхая мясціна».
П. Броўка. «Летам».
А. Дзеружынскі. «Грыбны дождж ык».
І. Муравейка. «Сонца».
П. Броўка. «Летам».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VI КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:
аб ролі кнігі як асноўнай крыніцы ведаў;
розных відах чытання: уголас і моўчкі («сам сабе»);
вершаваным і празаічным тэксце;
неабходнасці падмацавання ўласных высноў цытатамі з мастацкага твора;
тэматыцы асобных мастацкіх твораў;
размежаванні мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці.
Вучні ведаюць і прымяняюць:
арфаэпічныя нормы беларускай мовы ў вусным маўленні;
інтанацыйныя канструкцыі ў залежнасці ад камунікатыўнай сітуацыі ў вусным выказванні;
жанравую спецыфіку асобных твораў (апавяданне, казка) у працэсе гутаркі па прачытаным творы.

Вучні выкарыстоўваюць у творчай дзейнасці ўменні:

самастойна прыдумваць назвы мастацкіх твораў;

сістэматызаваць інфармацыю для складання невялікага аповеду паводле ілюстрацыі пад кіраўніцтвам настаўніка;

пераказваць змест мастацкага твора.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

вылучаць у тэксце незнаёмыя словы і выразы, звяртацца да дарослага за іх тлумачэннем;

удзельнічаць у дыялогу з дарослым і аднагодкам;

вербальнымі і невербальнымі сродкамі перадаваць эмоцыі ад прачытанага;

суадносіць змест мастацкага твора з уласным сацыяльным вопытам;

прагназаваць змест мастацкага твора пры дапамозе ілюстрацый і загалоўкаў;

чытаць часткова на памяць 2–3 вершаваныя творы;

атаясамліваць сваю прыналежнасць да беларускага народа.

VII клас

Родная Беларусь (5 гадзін)

Я. Сіпакоў. «Наш край».

П. Броўка. «Беларусь».

А. Дзеружынскі. «Я спяваю, ты спявай!».

П. Броўка. «Радзіма».

Э. Агняцвет. «Зямля з блакітнымі вачамі».

М. Пазнякоў. «Мы – беларусы».

З. Бандарына. «Дарагі падарунак» (з жыцця Янкі Купалы).

Я. Колас. «Успамін».

В. Шніп. «Белая чапля».

А. Вярцінскі. «Што такое Радзіма?».

М. Пазнякоў. «Родная мова».

Н. Гілевіч. «Я – беларус».

Я. Крупенька. «Ёсць у кожнага з нас…» (урывак з верша).

У. Караткевіч. «Мая Беларусь».

А. Дзеружынскі. «Радзіма».

К. Каліна. «Буслы».

Я. Сіпакоў. «Непаўторны край».

В. Сумараў. «Мой дом».

Фарбы восені (4 гадзіны)

П. Прыходзька. «Восень».

А. Дзеружынскі. «У вырай».

В. Гурскі. «Развітальная песня».

У. Мацвеенка. «Гарачая пара».

Т. Мушынская. «Ураджай».

П. Місько. «Восеньскім днём».

К. Жук. «У бары».

К. Каліна. «Лістапад».

Р. Ігнаценка. «Лістападнічак».

П. Броўка. «Восень».

З. Бяспалы. «Услед за сонцам».

М. Танк. «Бабка».

Р. Ігнаценка. «Лістапад».

В. Гардзей. «Залаты лістапад».

Працуй – Радзіму мацуй (3 гадзіны)

А. Астрэйка. «Размова аб прафесіях».

Р. Бензярук. «Птах на будоўлі».

М. Сліва. «Два клёнікі».
П. Пранузa. «Ах, як хораша на сэрцы…».
М. Чарняўскі. «Тату я дапамагаю».
Я. Бяганская. «Каму сказаць «дзякуй»?».
В. Вітка. «Хто што робіць?».
М. Даніленка. «Трэба».

Малюнкі зімы (4 гадзіны)

Ц. Гартны. «Зімні вечар».
М. Хведаровіч. «Снег».
Я. Колас. «Надыход зімы».
М. Багдановіч. «Зімой».
А. Ставер. «Зіма».
М. Маляўка. «Каляда».
А. Васілевіч. «Калінавая рукавічка».
У. Мацвеенка. «Зімовыя загадкі».
Т. Мушынская. «Зімовыя забавы».
М. Чарняўскі. «Завіруха».
Я. Колас. «На рэчцы зімою».
Г. Аўласенка. «Хто як зімуе?».
М. Пазнякоў. «Зімовыя птушкі».
Р. Ігнаценка. «Каму холадна, каму душна».

Будзь чалавекам (3 гадзіны)

М. Дукса. «Сябры».
В. Вітка. «Дзень нараджэння».
І. Муравейка. «Стол».
А. Якімовіч. «Каб не сварыліся».
Р. Дамброўская. «Хлопчык і крынічка».
Н. Галіноўская. «Дзякуй, чалавек!».
У. Дубоўка. «Шануйце ўсё жывое».
У. Паўлаў. «Малайчына».
В. Сухамлінскі. «Як Сяргейка навучыўся шкадаваць».

Вусная народная творчасць (4 гадзіны)

«Як мужык гусей дзяліў» (казка).
«Андрэй за ўсіх мудрэй» (казка).
«Ганарыстая варона» (казка).
«З рога ўсяго многа» (казка).
«Музыкі» (казка).

Вясна-чараўніца (4 гадзіны)

Я. Колас. «Уцякай, мароз-дзядуля!..».
А. Асіпенка. «Як вясна зіму прагнала».
А. Дудараў. «Буслы».
А. Якімовіч. «Дапамога».
М. Пазнякоў. «Садзім алею».
З. Верас. «Прыйшла вясна».
З. Бядуля. «Вясна».
А. Дзеружынскі. «Вясёлая песня».
А. Данільчык. «Добры дзень, вясна!».
У. Дубоўка. «Пільная варта».
Р. Ігнаценка. «Гасцінец».
М. Багдановіч. «Па-над белым пухам вішняў...».

Ішла вайна народная (4 гадзіны)

В. Жуковіч. «Бусел над Хатынню».
І. Муравейка. «Праўнук Перамогі».
А. Вярцінскі. «Два полі».
М. Лужанін. «У апошнія дні вайны».
А. Бачыла. «Ціха сосны шумяць».
П. Броўка. «А хіба ёсць, што забываюць?».
А. Астрэйка. «Плошча Перамогі».

Старонкі лета (4 гадзіны)

К. Жук. «Лета выспела якое!».
А. Капусцін. «Цвёрдае слова».
М. Ліпская. «Люблю я родную прыроду...».
М. Гамолка. «У грыбах».
Я. Галубовіч. «Птушыная кладачка».
В. Хомчанка. «Музыка ў бары».
К. Камейша. «Не спяшайся, лета».
У. Ягоўдзік. «Жмені ягад» («Суніцы»).
Я. Колас. «У грыбах».
П. Глебка. «Летні дзень».
В. Вольскі. «Першы вылет».
Р. Ігнаценка. «Залатая пара».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VII КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб асноўных асаблівасцях рознага роду казак (пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя);

змесце прачытаных мастацкіх твораў, іх персанажах;

магчымасці ўстанаўлення сэнсавых сувязяў паміж падзеямі (у тым ліку пры дапамозе дарослага).

Вучні ведаюць і прымяняюць:

арфаэпічныя нормы беларускай мовы з улікам граматычных форм у вусным маўленні;

інтанацыйныя канструкцыі ў залежнасці ад камунікатыўнай сітуацыі і неабходнасці вылучэння пэўных лексічных адзінак у вусным выказванні;

жанравую і родавую спецыфіку асобных твораў у гутарцы па прачытаным творы;

правілы гігіены чытання і неабходнасць паважлівага стаўлення да кнігі ў паўсядзённай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай дзейнасці:

тлумачэнне загалоўка мастацкага твора;

сэнсавы аналіз мастацкага твора з мэтай стварэння ўласнага загалоўка, выкарыстоўваючы цытаты з тэксту;

серыю малюнкаў для стварэння ўласнага невялікага аповеду (магчыма, з дапамогай дарослага);

сціслы пераказ мастацкага твора;

чытанне па ролях;

словы і выразы, якія ўказваюць на настрой персанажа.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

вылучаць у тэксце незнаёмыя словы і выразы, шукаць іх тлумачэнне ў розных крыніцах інфармацыі;

дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі;

вербальнымі і невербальнымі сродкамі перадаваць эмоцыі ад прачытанага, выказваць свае адносіны да адлюстраваных у мастацкім творы падзей, з’яў, учынкаў;

вызначаць асноўных персанажаў і вызначаць іх рысы характару;

ацэньваць уласнае і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

чытаць на памяць 2–3 вершаваныя творы (па магчымасці выразна);

суадносіць дзеянне ў мастацкім творы з гістарычным часам (мінулае, сучаснае, будучае).

VIII клас

Родная Беларусь (5 гадзін)

А. Бадак. «Ты хто?».
Я. Сіпакоў. «Беручы – аддаваць».
Р. Ігнаценка. «Родная зямля».
К. Цвірка. «Там яна…».
В. Вітка. «Спадчына».
У. Ліпскі. «Адкуль пайшлі назвы».
П. Броўка. «Кажуць, ёсць краіны-цуды».
М. Багдановіч. «Краю мой родны! Як выкляты Богам...».
Я. Купала. «Сонцу».
І. Калеснік. «Бацькоўская хата».
Н. Гілевіч. «Казачная зямля».

Фарбы восені (4 гадзіны)

Я. Колас. «Восень».
Э. Агняцвет. «Хлеб».
П. Місько. «Добры чалавек».
В. Жуковіч. «Свята ў будзень».
І. Навуменка. «Шчаслівы дзень».
М. Мятліцкі. «Ясева просьба».
М. Янчанка. «А таму!».
Я. Галубовіч. «Смелая вавёрачка».
А. Грачанікаў. «Як ападае ліст...».

Працуй – Радзіму мацуй (3 гадзіны)

П. Панчанка. «Страчаны дзень».
П. Глебка. «Закон тваёй Радзімы».
В. Зуёнак. «Прыйдзі аднойчы...».
М. Кусянкоў. «Пазарасталі сцежкі-дарожкі».
М. Танк. «Паклон хлебу».
І. Муравейка. «Эх, як добра працаваць!».
В. Зуёнак. «Будзь заўсёды, як Радзіма, добры...».
Л. Арабей. «Ісці ў разведку».

Малюнкі зімы (4 гадзіны)

П. Пранузa. «Іскрыцца кожная былінка».
Р. Ігнаценка. «У зімовым садку».
В. Вольскі. «Студзень» («Ой, як сцюдзёна на дварэ…»).
Я. Колас. «Калядны вечар».
М. Маляўка. «Зімовы яблык».
А. Асіпенка. «Прыгожая лісіца».
Н. Гілевіч. «У завіруху».
М. Зарэмба. «Аднойчы раніцай».
А. Дзеружынскі. «Зімой вясна».

Будзь чалавекам (3 гадзіны)

Ю. Свірка. «Мама спіць…».
М. Даніленка. «Коцікі на вярбіне».

У. Дубоўка. «Пра дзеда і ўнука».
В. Жуковіч. «Што чалавека лечыць?».
А. Пысін. «Рукі бацькі».
В. Гардзей. «Гультайка».
В. Шніп. «Маці без бацькі сумуе...».
Я. Маўр. «Шчасце».

Вусная народная творчасць (4 гадзіны)

«Чаму заяц, лісіца ды воўк разам не сыходзяцца» (беларуская народная казка).
«Селянін, мядзведзь і лісіца» (беларуская народная казка).
«Людзей слухай, а свой розум май» (беларуская народная казка).
Загадкі.
Прыказкі і прымаўкі.

Вясна-чараўніца (4 гадзіны)

М. Маляўка. «Вяснянка».
П. Рунец. «Вясна прыйшла».
В. Жуковіч. «Вясна ідзе».
Я. Маўр. «На крызе».
М. Гіль. «Якое дрэўца прыжываецца?».
В. Шымук. «Вішні».
Я. Галубовіч. «Не пакінулі ў бядзе».
У. Дубоўка. «Як сінячок да сонца лётаў».
А. Клышка. «Хатка шпака».

Ішла вайна народная (4 гадзіны)

В. Вольскі. «Подзвіг Мікалая Гастэлы».
В. Хомчанка. «Ластаўка».
Г. Васілеўская. «Геройскі ўчынак».
К. Крапіва. «Партызан Міша Сільніцкі».
А. Васілевіч. «Партызанка Кніга».
П. Прыходзька. «Салдат на п’едэстале».
В. Адамчык. «Салодкія яблыкі».
Я. Маўр. «Драўляная лыжка».
П. Макаль. «Голас вечнага хлопчыка».

Старонкі лета (4 гадзіны)

С. Грахоўскі. «Прыходзіць лета звонкае…».
Я. Колас. «Лета».
З. Бяспалы. «Грэбля».
В. Гарбук. «У садзе ноччу».
В. Лукша. «Крынічка».
М. Корзун. «Міколкаў барометр».
А. Гурло. «Нашы птушкі».
Э. Агняцвет. «Прымета лета».
Б. Сачанка. «Кошык малін».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ VIII КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб асаблівасцях асноўных жанраў вуснай народнай творчасці (казкі, загадкі, прыказкі і прымаўкі);

змесце прачытаных і абмеркаваных мастацкіх твораў, іх персанажах;

магчымасці пабудовы тэксту ад першай і трэцяй асоб;

магчымасці ўстанаўлення сэнсавых сувязяў паміж падзеямі (пераважна самастойна);
магчымасці вылучэння галоўнай думкі мастацкага твора;
інтаніраванні сказаў у адпаведнасці са знакамі прыпынку;
вобразных выяўленчых сродках у мастацкім творы.
Вучні ведаюць і прымяняюць:
сэнс прачытанага ўслых і сам сабе, паняцце ідэі мастацкага твора ў час гутаркі па прачытаным творы;
эмацыйна афарбаваную лексіку пры камунікацыі з дарослымі і аднагодкамі.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай дзейнасці:
чытанне па ролях;
драматызацыю твора;
урыўкі з твора, якія перадаюць настрой у мастацкім творы;
партрэт і характарыстыку герояў мастацкага твора (пры дапамозе дарослага);
складанне плана мастацкага твора;
пераказ зместу мастацкага твора;
выбарачнае чытанне па заданні дарослага;
удзел у дыялогах з выкарыстаннем выразаў з тэксту;
уласна створаны тэкст па аналогіі з прачытаным (магчыма, з дапамогай дарослага).
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
складаць план мастацкага тэксту;
самастойна рыхтавацца да выразнага чытання твора;
прагназаваць далейшае развіццё падзей у творы з праекцыяй на рэальнае жыццё ў адпаведнасці з ілюстрацыямі і загалоўкам;
чытаць на памяць 3–4 вершаваныя творы (пажадана выразна);
ацэньваць уласнае і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;
працаваць у групах і парамі (з дапамогай дарослага ці аднагодкаў).

IX клас

Родная Беларусь (5 гадзін)

Я. Колас. «О, край родны, край прыгожы!..».
У. Ліпскі. «Ад роду – да народу».
В. Вітка. «Белая Русь».
А. Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць...».
У. Караткевіч. «Бацькаўшчына».
М. Лынькоў. «Першы скачок».
К. Камейша. «Ля карты Радзімы».
У. Ліпскі. «Айчына».
К. Буйло. «Люблю».
В. Вітка. «Белая Русь».

Родныя вобразы прыроды (8 гадзін)

В. Жуковіч. «Слухай родную прыроду».
М. Чарняўскі. «Сонейка ўзышло».
Н. Галіноўская. «Зямля мая…».
У. Ліпскі. «Машына мова і дзедава замова».
А. Вольскі. «Безбілетная падарожніца».
Я. Хвалей. «Што за інтэрнат?».
А. Дзеружынскі. «Хто пра што…».
У. Караткевіч. «Белавежа».
З. Бядуля. «Зямля».
В. Зуёнак. «Поле», «Будзем сілы набірацца».
А. Вялюгін. «Спелы бор».
В. Гардзей. «Рагаты грыбнік».
І. Муравейка. «Лясныя дактары».

Я. Колас. «На рэчцы».
Я. Купала. «Мароз».
М. Багдановіч. «Возера».
В. Вольскі. «Месяц за месяцам».

Працуй – Радзіму мацуй (3 гадзіны)

М. Танк. «Садзіце лясы».
Р. Бензярук. «Будзень і Свята».
М. Даніленка. «Трэба».
Л. Дайнека. «Усім класам лес ратуем».
Я. Клімчанка. «Знайдзі сябе».
Н. Галіноўская. «Рукі рабочыя».

Асветнікі зямлі беларускай (4 гадзіны)

Ефрасіння Полацкая. «Жыціе Ефрасінні Полацкай».
Кірыл Тураўскі. Словы. Казанні. Павучанні.
Францыск Скарына. З прадмовы да «Псалтыра».
Мікола Гусоўскі. «Песня пра зубра».

Будзь чалавекам (3 гадзіны)

А. Пысін. «З чаго чалавек пачынаецца».
П. Броўка. «Будзь верны!».
Н. Мацяш. «Гора».
І. Муравейка. «Бабуля захварэла».
В. Ткачоў. «Канфуз».
В. Швед. «Ілгун».
П. Рунец. «Два яблыкі».

Вусная народная творчасць (4 гадзіны)

Беларускія народныя песні (абрадавыя, лірычныя).
«Бяздоннае багацце» (паданне).
«Нарач» (легенда).
«Сож і Дняпро» (легенда).

Дружба – вялікая справа (4 гадзіны)

М. Лужанін. «Ліст маломy сябру».
А. Русак. «Мой сябра».
П. Рунец. «Не хацеў хваліцца».
Т. Кляшторная. «Ветлівыя словы».
В. Хомчанка. «Крыўда».
М. Пазнякоў. «Сяргей».
Я. Бяганская. «Сябры».
А. Александровіч. «Наш дзень».
Д. Слаўковіч. «Важнае пісьмо».
П. Рунец. «Аднойчы вечарам».
Р. Бензярук. «Дружбакі».

Ішла вайна народная (4 гадзіны)

Я. Колас. «Салдату».
Е. Лось. «Дзяўчаты мінулай вайны».
К. Чорны. «Юныя разведчыкі».
В. Зуёнак. «З вайны сустракалі мацеркі сыноў...».
М. Лынькоў. «Васількі».
Э. Агняцвет. «Гэты ціхі куток».

В. Быкаў. «Сваякі».
М. Даніленка. «Ордэн».
М. Чарняўскі. «За ўсё ўдзячны ім».
П. Кавалёў. «Вавёрка-партызанка».

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IX КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:
аб розных відах чытання: сам сабе, выбарачнае чытанне, чытанне па ролях, выразнае чытанне;
гістарычных асобах, беларускіх асветніках, іх ролі ў гісторыі нашай Радзімы;
змесце прачытаных і абмеркаваных мастацкіх твораў, іх вобразнай сістэме, жанравай і тэматычнай прыродзе;
асаблівасцях асноўных жанраў вуснай народнай творчасці (песня, легенда, паданне);
магчымасці ўстанаўлення сэнсавых сувязяў паміж падзеямі;
размежаванні апісальнай і апавядальнай частак у мастацкім творы;
ролі вобразных выяўленчых сродкаў пры стварэнні мастацкіх вобразаў;
ролі эмацыйна афарбаванай лексікі ў ідэйным напаўненні мастацкага твора;
спосабах перадачы аўтарскіх адносін да падзей, якія апісваюцца.
Вучні ведаюць і прымяняюць:
неабходнасць захавання інтанацыі ў канцы і сярэдзіне сказа ў адпаведнасці са знакамі прыпынку ў працэсе чытання;
неабходнасць вылучэння пэўных слоў ці выразаў з дапамогай лагічнага націску (па ўзоры) у працэсе вуснай камунікацыі;
паняцці «тэма», «ідэя» мастацкага твора ў час гутаркі аб прачытаным творы.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай дзейнасці:
выразнае чытанне па ролях;
драматызацыю твора з прыдуманымі элементамі;
партрэт і характарыстыку герояў мастацкага твора з мэтай ацэнкі іх дзеянняў і ўчынкаў;
складанне плана мастацкага твора;
пераказ зместу мастацкага твора ад трэцяй асобы;
падбор эпізодаў мастацкага твора па заданні дарослага;
складанне ўласных тэкстаў пра герояў прачытаных мастацкіх твораў;
падбор загалоўкаў да частак тэксту.
Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:
адрозніваць гераічныя ўчынкі ў розных жыццёвых сітуацыях;
прагназаваць далейшае развіццё падзей у творы з праекцыяй на рэальнае жыццё ў адпаведнасці з жанравымі асаблівасцямі твора, яго агульнай скіраванасцю;
чытаць часткова на памяць 5–6 вершаваных твораў (пераважна выразна);
ацэньваць уласнае і чужое чытанне на памяць;
самастойна працаваць у групах і парамі.

X клас

Народныя пісьменнікі Беларусі (35 гадзін)

Янка Купала. «Мая малітва», «Явар і каліна», «Бандароўна».
Якуб Колас. «Не бядуй!», «Беларусам», «Першы гром», «Новая зямля».
Пятрусь Броўка. «Надыход восені», «Александрына», «А ты ідзі…», «Родныя словы».
Кандрат Крапіва. «Дыпламаваны баран», «Махальнік Іваноў».
Аркадзь Куляшоў. «Я хаце абавязаны прапіскаю…», «Над брацкай магілай», «Спакойнага шчасця не зычу нікому…».
Максім Танк. «Каб ведалі», «Родная мова».
Янка Брыль. «Memento mori».

Пімен Панчанка. «Краіна мая», «Герой», «Той дзень прайшоў і страчаны навек…».

Іван Мележ. «Людзі на балоце».

Іван Шамякін. «Непаўторная вясна», «Гандлярка і паэт».

Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў».

Ніл Гілевіч. «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Родныя дзеці».

Іван Чыгрынаў. «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».

Іван Навуменка. «Хлопцы самай вялікай вайны…».

Рыгор Барадулін. «Божа, паспагадай усім», «Яна адна…».

Андрэй Макаёнак. «Трыбунал».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ X КЛАСА

Вучні маюць уяўленні:

аб родавай, жанравай і тэматычнай разнастайнасці беларускай літаратуры XX ст.;

змесце прачытаных і абмеркаваных мастацкіх твораў, іх вобразнай сістэме, жанравай і тэматычнай прыродзе;

некаторых фактах біяграфіі беларускіх пісьменнікаў XX ст., творы якіх чыталіся;

адрозненні мастацкіх вобразаў і рэальных гістарычных асоб;

уплыве вуснай народнай творчасці на мастацкую літаратуру;

размежаванні апісання прыроды і чалавека ў мастацкім творы.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

правілы і неабходнасць розных відаў чытання ў паўсядзённай дзейнасці;

неабходнасць перадачы пэўнага сэнсу з дапамогай лагічнага націску ў працэсе вуснай камунікацыі;

паняцці «тэма», «ідэя», «кампазіцыя» мастацкага твора падчас гутаркі аб прачытаным творы.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай дзейнасці:

розныя віды пераказу зместу мастацкага твора з дапамогай плана і без яго;

славеснае і (або) мастацка-выяўленчае апісанне вобразаў мастацкага твора;

складанне тэкстаў пра герояў прачытаных мастацкіх твораў з выкарыстаннем сродкаў мастацкай выразнасці;

падбор загалоўкаў да частак тэксту, у тым ліку з дапамогай цытат.

Вучні валодаюць сацыякультурнымі ўменнямі:

перадаваць свае адносіны да дзеянняў і ўчынкаў герояў у параўнанні з адносінамі іншых людзей;

вызначаць агульны эмацыйны фон мастацкага твора;

адрозніваць гістарычныя падзеі і падзеі, якія апісваюцца ў мастацкім творы, знаходзіць агульнае і адметнае;

прагназаваць далейшае развіццё падзей у творы з праекцыяй на рэальнае жыццё ў адпаведнасці з жанравымі асаблівасцямі твора, яго агульнай скіраванасцю, пазатэкставай інфармацыяй;

вызначаць матывы дзеянняў і ўчынкаў герояў мастацкіх твораў;

чытаць на памяць 5–6 вершаваных твораў, урыўкаў з празаічных тэкстаў (пераважна выразна);

удзельнічаць у абмеркаванні прачытанага;

арганізоўваць працу ў групах і парамі.